*Масейчук Л.І.*

# ЭКСКУРСІЙНЫЯ ЗАНЯТКІ У СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ: МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТ

*Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца экскурсійны занятак як найбольш атрактыўная форма засваення ведаў. Аўтар звяртае ўвагу, што пры падрыхтоўцы і правядзенні такога віду заняткаў прымяненне суб’ектнага падыходу і тымбілдынгавага метаду дае высокі каштоўнасна-арыентаваны і рэкрэацыйны эфект. Робіцца акцэнт на тым, што структура экскурсійных заняткаў падобная да структуры семінарскіх заняткаў, аднак не з’яўляецца тоеснай ім. Прыводзіцца схематычны прыклад правядзення экскурсійных заняткаў на базе Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі.

*Ключавыя словы: экскурсійныя заняткі, вышэйшая адукацыя, метад, структура, студэнт.*

*Masejchuk L.I.*

# EXCURSION LESSON IN THE SYSTEM OF HIGHER EDUCATION: METHODOLOGICAL ASPECT

*Belarusian State Archive of Scientific and Technical Documentation*
*Minsk, Belarus*

**Abstract**. The article considers excursion lessons as the most attractive form of learning. The author draws attention to the fact that in the preparation and conduct of this type of training, the use of the subjective approach and the team building method gives a high value-oriented and recreational effect. Emphasis is placed on the fact that the structure of the excursion lesson is similar to the structure of the seminar lesson, but is not identical to it. A schematic example of a guided tour based on the Belarusian State Archive of Scientific and Technical Documentation is given.

*Keywords: excursion lesson, higher education, method, structure, student.*

Першыя звесткі пра экскурсійныя заняткі з'явіліся ў другой палове XVIII ст. Я.-А. Каменскі неаднаразова выказваўся наконт мэтазгоднасці правядзення падобнага роду заняткаў. Глыбокае тэарэтычнае абгрунтаванне выкарыстання ў працэсе навучання такога метаду як экскурсіі знайшло ў працах К. Дз. Ушынскага.

Пасля стварэння ў 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – БДУ) з боку выкладчыцкага персаналу надавалася вялікая ўвага такому віду навучальнага інавацыйнага занятку як экскурсія [1; 2]. Менавіта ў 1920-я гг. экскурсійны занятак атрымаў дакладнае метадычнае абгрунтаванне [3; 4], якое і ў наш час не страціла сваёй актуальнасці [5; 6].

Многія выкладчыкі блытаюць аглядную экскурсію і экскурсійны тэматычны занятак (далей – экскурсійны занятак).

Выкладчыкам неабходна памятаць, што экскурсійны занятак гэта не экскурсія ў класічным выглядзе! Экскурсійныя заняткі зяўляюцца па сутнасці семінарскім заняткам, як правіла, вынесеным за межы навучальнай аўдыторыі. Пры падрыхтоўцы да экскурсійнага занятку выкладчык павінен дакладна вызначыць яго мэты і задачы, абмеркаваць іх з экскурсаводам (у тым выпадку, калі не ён праводзіць экскурсію), прадумаць змест экскурсіі ў адпаведнасці з імі. Педагог самастойна (або разам з экскурсаводам) піша тэкст аб аб’екце экскурсіі, рыхтуе творчыя заданні для студэнтаў па тэме экскурсійнага занятку.

Пры падрыхтоўцы і правядзенні падобнага віду заняткаў найбольш распаўсюджана, сярод выкладчыкаў, прымяненне суб’ектнага падыходу і тымбілдынгавага метаду.

Суб’ектны падыход, заснаваны на адносінах да навучэнца не як да аб'екта або да прадмета адукацыйнага ўздзеяння, а як да суб’екта, які мае права выбару і нясе адказнасць за ўсе дзеянні, дае магчымасць стварыць умовы для максімальнай рэалізацыі здольнасцей кожнага ўдзельніка занятку, у тым ліку і метапрадметных.

Тымбілдынгавы метад (метад камандаўтварэння) вучыць навыкам працы ў камандзе, узаемапавазе, узаемадапамозе, талерантнасці і этыцы зносін. Гэта дазваляе атрымаць агрэгаваны эфект, які ўзаемаўзмацняе адукацыйнае і выхаваўчае педагагічнае ўздзеянне. У канчатковым выніку дадзеная тэхналогія дае высокі каштоўнасна-арыентаваны і рэкрэацыйны эфект [6].

Як ужо згадвалася вышэй, структура экскурсійнага занятку падобная да структуры семінарскага занятку, аднак не з’яўляецца тоеснай яму. Разгледзім яе.

*Арганізацыйна-матывацыйная частка.* Выкладчык паведамляе студэнтам тэму, мэту, задачы занятку, знаёміць з асноўнымі пытаннямі і аб'ектамі экскурсіі.

*Актуалізацыя апорных ведаў.* Перад экскурсійным заняткам трэба ўзгадаць са студэнтамі асноўныя моманты, звязаныя з тэмай экскурсіі.

*Непасрэдна экскурсійная частка.* Перад экскурсіяй у абавязковым парадку праводзіцца кароткі інструктаж па тэхніцы бяспекі і правілах паводзін. Падчас непасрэдна экскурсійнай часткі задача педагога заключаецца ў тым, каб студэнты былі не проста гледачамі і слухачамі, а як мага больш актыўна ўдзельнічалі: рабілі запісы, задавалі пытанні і інш. Для гэтага неабходна загадзя вызначыць метады стымулявання пазнавальнай актыўнасці студэнтаў.

*Абагульненне і сістэматызацыя ведаў* адбываецца ў канцы экскурсійнага занятку: студэнты адказваюць на абагульняючыя пытанні, дзеляцца сваім меркаваннем і ўражаннямі.

*Вынікі экскурсійнага занятка*: выкладчык ацэньвае працу студэнтаў, дае, калі ёсць неабходнасць, заданне на дом.

Вопыт апрабацыі аўтарам дадзенай тэхналогіі пацвярджае яе запатрабаванасць як у выкладчыкаў, так і студэнтаў, паколькі экскурсійныя заняткі – гэта інтэрактыўная адукацыйная тэхналогія, якая дазваляе эфектыўна засвоіць матэрыял.

Сярод студэнтаў, асабліва тэхнічнага профілю, часцей за ўсё назіраюцца цяжкасці ў вывучэнні такой абавязковай дысцыпліны як «Гісторыя Беларускай дзяржаўнасці». Напрыклад: спосабы камплектацыі і сістэматызацыі дакументаў,

якія паступаюць на захоўванне ў архівы, не зразумелыя для большасці навучэнцаў не профільных напрамкаў і дрэнна ўспрымаюцца ў тэорыі. У сувязі з гэтым экскурсійны занятак з'яўляецца найбольш атрактыўнай формай засваення ведаў, бо навучанне спалучаецца з забаўкай і рэкрэацыяй, праходзіць на фоне эмацыйнага ўздыму і максімальнай навочнасці.

У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі (далей – БГАНТД) рэгулярна праводзяцца падобныя заняткі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў як гуманітарных, так і тэхнічных спецыяльнасцей. Наладжана плённае супрацоўніцтва з гістарычным факультэтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам і філіялам Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта «Мінскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы каледж».

Разгледзім схематычны прыклад экскурсійных заняткаў, якія праводзяцца сярод студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў на базе Беларускага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі.

Пункты «арганізацыйна-матывацыйная частка» і «актуалізацыя апорных ведаў» ажыццяўляюцца самім выкладчыкам і/або экскурсаводам пасля папярэдняга абмеркавання тэмы экскурсійнага занятку.

Паколькі будынак, у якім размяшчаецца БГАНТД, з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю, перад экскурсіяй праводзіцца інструктаж па тэхніцы бяспекі і правілах паводзін.

Сам экскурсійны занятак уключае ў сябе:

1. Знаёмства з гісторыяй будынка, у якім размяшчаецца Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, яго стварэннем, структурай, напрамкамі дзейнасці.

2. Наведванне сховішчаў дакументаў суправаджаецца расповедам пра перыядызацыю гісторыі Беларусі і віды пісьмовых крыніц, тлумачыцца, чым праектная дакументацыя адрозніваецца ад тэкставага дакумента. На гэтым этапе студэнтам задаюцца пытанні, якія віды гістарычных крыніц яны ведаюць? Чым дакументальныя крыніцы адрозніваюцца адна ад адной? Што такое матэрыяльныя і не матэрыяльныя крыніцы? (Пытанні могуць задавацца суправаджаючым выкладчыкам і / або ўзгадняцца з экскурсаводам).

3. Азнаямленне з архіўнымі фондамі і калекцыямі, сабранымі ў архіве. Студэнтам даецца магчымасць папрацаваць з праектнай і канструктарскай дакументацыяй, а таксама з дакументамі з асабістых фондаў.

4. У заключэнні студэнтам прапануецца падзяліцца сваім меркаваннем і ўражаннямі ад экскурсіі, задаць пытанні. Як правіла, на экскурсійных занятках у архіве студэнтаў цікавяць пытанні практычнага плана: як можна патрапіць у архіў? дзе шукаць сваіх сваякоў? як распрацаваць генеалагічнае дрэва? На ўсе гэтыя пытанні яны атрымліваюць вычарпальныя адказы.

Для большасці студэнтаў «адкрыццём» з’яўляецца інфармацыя аб тым, што ў сучасных архівах захоўвацца дакументы, якія дазваляюць з вялікай доляй верагоднасці ўзнавіць гістарычны перыяд, аддалены ад сучаснага чалавека на 100–500 гадоў.

Візуалізацыя дакументальнай гістарычнай спадчыны Беларусі дазваляе студэнтам структураваць веды па гісторыі сваёй краіны.

Вынікі экскурсійных заняткаў падводзіць выкладчык.

Прыняць удзел у такім экскурсійным занятку можа навучальная група да 15 чалавек. Дзень і час вызначаюцца загадзя. Тэма занятку можа мяняцца зыходзячы з адукацыйнай мэты і задач па папярэднім узгадненні з педагогам.

Такім чынам, экскурсійныя заняткі маюць сваю структуру, мэту і задачы адукацыйна-выхаваўчага характару. Экскурсійныя заняткі павінны цесна пераплятацца з тэмай семінарскага занятку. Па сутнасці гэта і ёсць семінарскі занятак, вынесены за межы вучэбнай аўдыторыі. Такі семінарскі занятак у форме экскурсіі (экскурсійны занятак) дазваляе вывучыць шырокую тэму вучэбнай праграмы за адзін дзень, што вельмі важна пры адсутнасці спецыяльна адведзеных на гэта дадатковых вучэбных гадзін. Экскурсійныя заняткі дапамагаюць студэнтам усвядоміць новыя магчымасці для развіцця свайго навуковага патэнцыялу.

**Літаратура**


1. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 86. Арк. 3,5.
2. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 87. Арк. 25.
3. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 752.
4. Мосейчук, Л. И. Организация семинарских занятий в Белорусском государственном университете в 20-е гг. XX в. / Л. И. Мосейчук // Труды Белорусского государственного технологического университета. – Серия VI. История, философия. – № 2 (227). – Минск : БГТУ, 2019. – С. 47–49.
5. Швырка, В. Н. Современные технологии визуализации учебной информации в методическом обеспечении самостоятельной работы студентов / В. Н. Швырка // Научно-методическое обеспечение университетского образования: история и перспективы развития : материалы Междунар. науч.-практ. интернет-конф., Респ. Беларусь, Минск, 26–27 окт. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т, Центр проблем развития образования ; редкол. : В. В. Самохвал (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2017. – С. 159–163.
6. Татаренко, И. И. Урок-экскурсия как наиболее эффективный способ усвоения регионального компонента учебной программы [Электронный ресурс]. – Майкоп, 2022. – Режим доступа : http://www.lsit.adygnet.ru/svedenija-ob-obrazovatelnoj-organizacii/obrazovanie/tvorcheskie-raboty-uchitelej/17-urokjekskursija. Дата доступа : 23.02.2022.